# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

***Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з'яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.***

***У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з'яўляецца юбілейным.***

50 гадоў

**Сіпакоў, Я. Веча славянскіх балад : Паэзія / Янка Сіпакоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1973. – 156, [2] с.**




У кнігу Янкі (Івана Данілавіча) Сіпакова (1936–2011) «Веча славянскіх балад» увайшло 96 прытчападобных балад, у якіх уваскрашаюцца драматычныя старонкі гісторыі славянскіх народаў ад першага да дваццатага стагоддзя нашай эры. У творах згадваюцца венеды і анты, дулебы і расаманы, паўстаюць гістарычныя постаці Кірылы і Мяфодзія, Скарыны, Каперніка, Яна Гуса, Х. Боцева, Ламаносава і іншых, услаўляюцца проста безыменныя героі з народа, чыё самаахвярнае жыццё злучыла мінулае і будучыню.

Мастацкае афармленне выдання выканаў Міхась Басалыга, яно выйшла тыражом у 6 000 экзэмпляраў.

За кнігу «Веча славянскіх балад» у 1976 годзе Янку Сіпакову прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы.

Другое выданне зборніка адбылося ў 1987 годзе, але яно было дапоўнена і ўключала ўжо 156 твораў.

# «Веча славянскіх балад» : 50 гадоў



У баладах Янкі Сіпакова прадстаўлены ўзоры ліра-эпасу рускага («Ростань»), украінскага («Булава»), балгарскага («Зброя», «Валы», «Лазня»), чэшскага («Збуйніца»), польскага («Розгі»), славенкскага («Плач»), македонскага («Пытанне»), лужыцкага («Вадзянік», «Чараўніца») і інш. славянскіх народаў. Гісторык Міхаіл Стралец адзначае: «Адчуваецца, што пісьменнік выдатна ведаў фальклор і гісторыю кожнага славянскага народа, максімальна ўлічыў звесткі навуковых, навукова-папулярных, даведачных выданняў па гэтых пытаннях, адлюстраваў практычна ўсе значныя падзеі ў гісторыі славянства».

У цэнтры некаторых балад зборніка – матывы гераічнай барацьбы за нацыянальную незалежнасць, у іншых увага скіравана на сацыяльныя супярэчнасці. Многія балады прысвечаны гістарычным асобам, мужным і годным людзям. Напрыклад, у баладзе «Шахматы», узнаўляюцца трагічныя старонкі жыцця князёў-дзекабрыстаў у Чыце, а героем «Клеткі» з'яўляецца кіраўнік сялянскага паўстання 1773–1775 гг. Емельян Пугачоў. Балада «Ноч» прысвечана ўкраінскаму пісьменніку Тарасу Шаўчэнка, а балада «Валы» – балгарскаму нацыянальнаму герою Хрысту Боцеву. Беларуская балада «Сяўба», сербская «Урок», польскія «Мячык», «Вязень» ды іншыя аб'яднаны тэмай Другой сусветнай вайны. У гэтых творах паказана, з аднаго боку, бязлітасная жорсткасць іншаземнай агрэсіі, з другога – сіла супраціўлення ёй галоўным чынам усходніх славян.

# «Веча славянскіх балад» : 50 гадоў

Кніга «Веча славянскіх балад» Янкі Сіпакова была высока ацэнена як літаратурнымі крытыкамі, так і пісьменнікамі, паэтамі і навукоўцамі. У прыватнасці, пасля выхаду зборніка адну з першых рэцэнзій напісаў Уладзімір Караткевіч, назваўшы яе «Справядлівасць» (змешчана ў восьмым томе збору ягоных твораў). Там былі такія радкі пра Янку Сіпакова і яго кнігу: «Гэты хлопец, сам таго не жадаючы, даў ладнага выспятка паэтам майго пакалення, і ў тым ліку мне. І дзякуй богу. Свет, дзе няма месца нечаканасцям – гэта не свет. І кніга гэта добра паслужыць людзям і Беларусі».

Анатоль Вярцінскі, прааналізаваўшы балады Янкі Сіпакова, адзначыў: «Паэт па-майстэрску выкарыстоўвае, накшталт вопытнага кінааператара, буйны план і іншыя ракурсы, якія даюць магчымасць наблізіць далёкае, ажывіць забытае. І тут думаеш пра таямнічую памяць сэрца, якая сапраўды «сильней рассудка памяти печальной».

Узгаданы вышэй гісторык Міхаіл Стралец с захапленнем пісаў: «Ёсць літаратары, якія напісалі толькі адзін твор і дзякуючы менавіта яму трапілі ў лік папулярных, атрымалі прызнанне на радзіме і за мяжой. Калі б Янка Сіпакоў напісаў толькі «Веча славянскіх балад», яго чакаў бы такі лёс». А Зіновій Прыгодзіч лаканічна вызначыў, ужо пасля смерці паэта, што «Веча славянскіх балад» – гімн усяму славянству».